# Секция 2

**В. А. Гуліцкая,**
*прафесар кафедры беларускай філалогіі*
*і сусветнай літаратуры,*
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт*

## НЕКАТОРЫЯ ШЛЯХІ І ПРЫЁМЫ ФАРМІРАВАННЯ КАМПЕТЭНЦЫІ СУЧАСНАГА СПЕЦЫЯЛІСТА

У тлумачальнай запісцы да тыпавой вучэбнай праграмы па дысцыпліне «Беларуская мова (прафесійная лексіка)» сутнасць кампетэнцыі падзялілі на некалькі звужаных паняццяў (на 12): кампетэнцыі культурна-вартаснай і асобаснай арыентацыі; грамадзянскасці і патрыятызму; сацыяльнага ўзаемадзеяння; камунікацыі; зберажэння здароўя; самаўдасканалення і інш.

Але, на нашу думку, працэс падрыхтоўкі спецыяліста не варта падзяляць на розныя кампетэнцыі. Спецыяліст стане кампетэнтным тады, калі будзе пастаянна назапашваць сістэмныя веды не толькі па сваёй спецыяльнасці, а ў сукупнасці з ведамі роднасных дысцыплін і набыццём сур’ёзнага навуковага багажу. У выніку сфарміруецца кампетэнтны спецыяліст, які ўмее не толькі рэалізаваць свае веды ў практычнай дзейнасці, але і вызначаць перспектыўныя задачы.

Больш за тое, быць кампетэнтным, на наш погляд, азначае не толькі быць азнаёмленым, інфармаваным, дасведчаным на першапачатковым узроўні, а мець свядомыя, глыбока асэнсаваныя прафесійныя веды ўжо як перакананні, якія спецыяліст будзе здольны адстойваць у дыскусіях, навуковых спрэчках.

Думаецца, што найважнейшымі элементамі *кампетэнцыі* з’яўляюцца паняцці свядомасці, добрасумленнасці і ўсведамлення высокай адказнасці. Каб нашы выпускнікі былі кампетэнтнымі ў шырокім сэнсе слова, патрэбна, па-першае, рабіць адбор пры залічэнні не толькі па сертыфікатах, а па схільнасцях, творчых здольнасцях, уласнай зацікаўленасці ў набыцці прафесійных ведаў; па-другое, каардынаваць прафесійныя дзеянні выкладчыкаў з іншымі калегамі для пашырэння кругагляду студэнтаў; па-трэцяе, не дазваляць навучэнцам замыкац-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ца ў сваёй вузкай спецыялізацыі, вучыць іх клапаціцца пра свой інтэлект, універсальную кампетэнцыю шляхам самаадукацыі.

У адукацыйным працэсе неабходна шырэй выкарыстоўваць актыўныя, інтэрактыўныя метады, і ў першую чаргу – метад параўнальна-гістарычнага аналізу, які павінен заняць адно з першых месцаў у выкладчыцкай практыцы, таму што ён дазваляе разглядаць пэўную з'яву ўсебакова, пачынаючы з яе вытокаў, гістарычнага развіцця ў роднасных галінах (структурах, мовах), бачыць сучасную сутнасць і выніковасць, каштоўнасць фактаў, з'яў. Параўнальна-гістарычны метад пабуджае да актыўнага асэнсавання, аргументаванай дыскусіі.

Набыццю ведаў садзейнічае падабраны з улікам індывідуальнай падрыхтаванасці студэнта матэрыял (пасільны для найслабейшых і ўскладнены для здольных), у выніку чаго ўзрастае ўласны інтарэс, узнікае штуршок да больш глыбокага пазнання праграмнага матэрыялу ці пэўнай тэмы. Ускладненыя заданні аналітычнага характару з вызначэннем першараднага, галоўнага і пералікам другасных вартасцей, каштоўнасцей тэксту таксама дапамагаюць выпрацоўваць уменне рабіць вывады, фармуляваць канчатковыя падагульненні, агульнае заключэнне, чаго звычайна не хапае ў дыпломных працах студэнтаў, нават пры багацці і разнастайнасці фактычнага матэрыялу.

Выкарыстанне ў навучальным працэсе сучасных электронных адукацыйных і інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій, наяўнасць камп'ютарнага асяроддзя таксама спрыяюць падрыхтоўцы высокаадукаваных, творчых і ўдумлівых спецыялістаў.

Пры фарміраванні ў выпускніка сацыяльна-прафесійнай кампетэнцыі важна ўсё: і лагічна пабудаваныя заняткі, і эмацыянальная падача матэрыялу, і тэмп маўлення, выразнасць мімікі, жэстаў выкладчыка, і прымяненне сучасных прыёмаў аналізу, сінтэзу, параўнання, аналогіі, канкрэтызацыі, і яркі, красамоўны, пераканальны ілюстрацыйны матэрыял, выкарыстанне інтэрактыўнай дошкі, экрана манітора, відэа- ці мультымедыйных фрагментаў і да т. п. Усё гэта спрыяе развіццю шырокіх магчымасцей для рэалізацыі індывідуальна-творчага і даследча-пошукавага патэнцыялу студэнта, дапамагае сфарміраваць самастойнага, адказнага, арганізаванага, мэтанакіраванага кампетэнтнага спецыяліста.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ